7. Кузнецов С.В., Семёнов И.Н. Рефлексивно-акмеологические аспекты развития профессионального мастерства / Рефлексия, образование и интеллектуальные инновации. - Новосибирск: Изд-во ИГУ, 1995. - С. 124-136.

8. Захаров В.П., Кухарева Л.В., Хрящева В.Ю., Гайда В.Л. Активные методы в подготовке студентов-психологов // Современные психолого-педагогические проблемы высшей школы. - Л.: Изд-во ЛГУ, 1985. - С. 78-79.

9. Игры, обучение, тренинг, досуг / Под ред. В.В Петрусинского. - М.: Б.и., 1994.- 135с.

10. Лушпаева Е.В. Развитие рефлексии в общении средствами социально-психологического тренинга: Дис. ... канд. психол. наук. - М., 1989. - 224 с.

11. Рудестам К. Групповая психотерапия. - М.: Прогресс, 1993. - 368 с.

12. Петровская Л.А. Теоретические и методологические проблемы социально-психологического тренинга. - М.: Изд-во МГУ, 1982. - 168 с.

13. Форверг М., Альберг Т. Характеристика социально-психологического тренинга поведения // Психол. журн. - 1984. - Т. 5. - № 4. -С. 57-64.

14. Робер М.А., Тильман Ф. Психология индивида и группы. - М.: Прогресс, 1988.-255с.

15. Групповая психотерапия / Под ред. Б.Д. Карвасарского, С. Ледера. - М.: Медицина, 1990. - 384 с.

## СТВАРЭННЕ ЗАКАНАДАЎЧАЙ БАЗЫ ДЛЯ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ ЯК АСПЕКТ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (1991-2005 гг.)

***Папко В.М.***

Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт, г. Брэст, Беларусь

Культурная палітыка з'яўляецца сістэмай юрыдычна-праравых, эканамічных, сацыяльна-палітычных, арганізацыйных мерапрыемстваў, якія накіраваны на фарміраванне пажаданай для грамадства і асобы культурнай сітуацыі. Мерапрыемствы культурнай палітыкі рэалізуюцца праз бюджэт, заканадаўства, кантроль, кадры, наданне ільгот і т.п. Дзяржава падтрымлівае дзейнасць культурных устаноў, фінансава, выступае гарантам, заказчыкам і спонсарам. Прафісійнае мастацтва патрабуе ўвагі з боку дзяржавы, якая выражаецца ў фінансавай падтрымцы і стварэнні заканадаўчай базы, неабходнай для свабоднага развіцця. У 1985-2000 гг. дзяржава з'яўлялася асноўным фундатарам і спонсарам развіцця прафесійнага мастацтва ў Беларусі, актыўным арганізатарам культурных мерапрыемстваў. Дзяржаўны бюджэт розных узроўняў быў асноўнай крыніцай фінансавання прафесійнага мастацтва. Сваю палітыку ў гэтай галіне дзяржава ажыццяўляла праз дзейнасць Міністэрства культуры, якое ўпраўляла мастацкімі дзяржаўнымі ўстановамі у краіне, утрымлівала ўстановы мастацкай адукацыі, супрацоўнічала з творчымі саюзамі.

У сяр. 80-х гг. XX ст. дзяржава была адзіным правадніком культурнай палітыкі. Сфера культуры ўспрымалася як адна з галін гаспадаркі БССР, таму ў кіраванні ёю дзяржава дабівалася планавання дзейнасці прафесійных устаноў культуры. Партыйныя органы БССР поўнасцю кантралявалі развіццё прафесійнага беларускага мастацтва. Савецкая сістэма ўпраўлення гэтай сферай не спрыяла развіццю нацыянальных асаблівасцей мастацтва, стрымлівала натуральныя працэсы ў культуры. Нагляд за зместам і формай твораў мастацтва пазбаўляў

творчых асобаў права на свабоднае выражэнне сваіх замыслаў. Кантроль з'яўляўся адной з галоўных функцый у дзейнасці мастацкіх саветаў, якія ажыццяўлялі нагляд за рэпертуарам творчых калектываў, сачылі за тым, каб прафесійнае мастацтва адлюстроўвала прынцыпы камуністычнай ідэалогіі. Вызначальную ролю ў падборы музычных і драматычных твораў для творчых калектываў адыгрывала міністэрства культуры. Своеасаблівую манаполію на стварэнне музычных твораў мелі члены Саюза кампазітараў. У цэлым фінансаванне прафесійнага мастацтва знаходзілася на высокім узроўні, праводзіліся шматлікія гастролі, выставы і іншыя мерапрыемствы.

У гады перабудовы дзяржаўная культурная палітыка вызначалася з агульнасавецкага цэнтра і кантралявалася партыйнымі органамі. Нягледзячы на працэсы дэмакратызацыі, гэтая палітыка была заснавана на савецкай ідэалогіі і дакладна вызначана. На хвалі агульнай дэмакратызацыі ўсіх сфер жыцця СССР адбывалася ломка сістэмы ідэалагічнага ўціску на установы культуры і творчых работнікаў, якія выконвалі ролю праваднікa прынцыпаў савецкай ідэалогіі. Эканамічныя цяжкасці прывялі да скарачэння устаноў культуры. Пагоршылася матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне сферы прафесійнага мастацтва. Перыяд перабудовы стаў пераломным момантам у развіцці беларускай культуры, значна ўзрасла яе роля ў грамадскім і палітычным жыцці рэспублікі. Дэмакратыя стварала магчымасць свабоднага карыстання беларускай культурнай спадчынай, ужывання і павышэння статуса беларускай мовы. Адным з элементаў дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да прафесійнага мастацтва з'явілася падтрымка творчай моладзі.

З атрыманнем незалежнасці пачаўся працэс рэарганізацыі сістэмы ўпраўлення культурай, губіліся культурныя сувязі з краінамі былога сацыялістычнага лагера і рэспублікамі СССР. Культурная палітыка беларускай дзяржавы пачала змяняцца, што садзейнічала захаванню і распаўсюджванню нацыянальных традыцый і культурнай спадчыны. Змяніўся падыход да дзяржаўнага заказу на твор мастацтва, які стаў сістэмай выдачы грантаў на стварэнне мастацкіх твораў. Адбываўся актыўны працэс стварэння і знікнення прафесійных творчых калектываў, некаторыя з іх атрамалі статус дзяржаўных, іншыя існавалі з падтрымкай спонсарскіх сродкаў. Творчыя саюзы аддзяліліся ад дзяржавы, паступова яны станавіліся незалежнымі партнёрамі дзяржаўнай улады. Прафесійныя калектывы сталі актыўнымі ініцыятарамі і арганізатарамі правядзення культурных акцый: фестываляў, пленэраў і г.д. Палітыка характаразавалася нявызначанасцю і адлюстроўвала стан агульнай разгубленасці ў грамадстве. Фінансавы крызіс адсунуў праблемы падтрымкі прафесійнай мастацкай культуры на другі план. Палажэннне закона "Аб культуры", згодна якому фінансаванне гэтай сферы павінна было складаць 3 % бюджэтных сродкаў дзяржавы, не выконвалася. Значна ўзрасло значэнне мясцовых улад і прадпрыемстваў у фінансаванні галіны, што спрыяла ажыўленню культурнага жыцця правінцыі.

Гэтая сітуацыя пачала яскрава змяняцца ў сяр. 90-х гг. ХХ ст., калі на дзяржаўным узроўні была асэнсавана неабходнасць паслядоўнай падтрымкі мастацтва і вылучэння прыярытэтных накірункаў развіцця сферы прафесійнага мастацтва. Дзяржава распрацоўвала і ажыццяўляла шматлікія праграмы па культурнаму развіццю рэгіёнаў і краіны ў цэлым. Фарміравалася юрыдычная база для рэгламентацыі ўзаемаадносін паміж дзяржавай і сферай культуры. Другая палова 90-х гг. ХХ ст. стала перыядам актывізацыі дзейнасці беларускай дзяржавы ў дачыненні культуры, палепшыўся стан фінансавання прафесійнага мастацтва. Аднак у даследуемы перыяд не сфарміраваўся механізм садзейнічання спонсарскай дзейнасці прадпрыемстваў і арганізацый, які б спрыяў укладанню недзяржаўных сродкаў у развіццё мастацкай сферы.

На працягу даследуемага перыяда дзяржаўныя органы кіравання сферай культуры і мастацтва змянілі свае адносіны да нацыянальных элементаў у прафесійнай мастацкай культуры. Дзейнасць міністэрства культуры, як дзяржаўнага органа, было скіравана на развіццё гістарычнага жанру ва ўсіх відах мастацтва, прапаганду мінулага краіны. Гэта адлюстравалася ва ўстаноўцы помнікаў гістарычным асобам і падзеям на Беларусі, адкрыцці новых музеяў, пераарыентацыі старых экспазіцый, рэстаўрацыі помнікаў старажытнай архітэктуры, пастаноўцы нацыянальных п'ес на сцэнах беларускіх тэатраў. Дзяржава стымулявала стварэнне высокамастацкіх твораў праз арганізацыю дзяржзаказу, конкурсаў, фестываляў і інш., папулярызавала творы беларускіх аўтараў сярод насельніцтва і за межамі Беларусі. Станаўленне незалежнасці стала стымулам для развіцця беларускага мастацтва, якое атрымала моцны духоўны штуршок, пачало засвойваць новыя тэмы, звярнулася да хрысціянскіх і нацыянальных каштоўнасцей. Павялічылася доля беларускамоўных спектакляў, некаторыя з тэатраў працавалі выключна на беларускай мове.

За перыяд існавання незалежнай Беларусі дзяржавай было прынята некалькі законаў і нарматыўных актаў у галіне культуры і мастацтва. Сярод іх самыя важныя законы "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (1992), "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь" (1995), "Аб аўтарскім праве і сумежных правах" (1996), "Аб музеях і музейных фондах Рэспублікі Беларусь" (1996), "Аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да Бернскай канвенцыі аб ахове дзяржаўных і мастацкіх твораў" (1997), "Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь" (1999), "Аб творчых саюзах і творчых работніках" (1999) і інш. Гэтыя законы рэгламентавалі адносіны паміж дзяржавай і творчымі работнікамі, якія аб'яднаны ў творчыя саюзы.

Супрацоўніцтва з творчымі саюзамі і арганізацыямі з'яўлялася адным з важнейшых накірункаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне прафесійнага мастацтва. У 1994 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі наступныя творчыя грамадскія арганізацыі: Канфедэрацыя творчых саюзаў, Саюз тэатральных дзеячаў, Саюз мастакоў, Саюз кампазітараў, Саюз музычных дзеячаў, Саюз кінематаграфістаў, Саюз архітэктараў, Саюз дызайнераў. [2, с. 109] Прафесійна-творчыя аб'яднанні займаліся сацыяльна-прававой абаронай сваіх членаў; правядзеннем акцый, якія садзейнічалі развіццю нацыянальнага мастацтва, захаванню традыцый, пашырэнню замежных сувязей. Творчыя саюзы паступова пераўтвараліся ў пасрэдніка паміж уладай і творчай асобай. Яны мелі права пашыраць спектр сваёй дзейнасці, займацца выдавецтвам, арганізацыяй выстаў, пленэраў, канферэнцый і г.д. У пачатку XXI ст. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 13 творчых саюзаў, членамі якіх з'яўлялася каля 8 тыс. чалавек. [4, с. 60]

У 1992 г. дзяржава адабрала ў творчых саюзаў ільготу НДС і вызваленне ад падатка на прыбытак. На з'ездах прафесійных творчых работнікаў, якія праходзілі пасля гэтай падзеі, выказвалася пажаданне, каб гэтая ільгота была вернута, было прапанавана дзяржаве ўзяць на сябе аплату творчых майстэрань мастакоў. Статус творчых саюзаў і іх членаў у новых палітычных і эканамічных умовах не быў вызначаны, існавала неабходнасць прыняцця адпаведнага закона.

З 1995 г. даволі актыўна абмяркоўвалася пытанне закона «Аб творчых саюзах», які б дазволіў рэгламентаваць дзейнасць творчага саюза, рэгуляваць адносіны паміж трыма бакамі: творчай асобай, саюзам і дзяржавай. Адным з важных палажэнняў закона павінна было стаць вызваленне творчага саюза ад падаткаў, што на думку распрацоўшчыкаў пасадзейнічала б умацаванню матэрыяльнай базы і спрыяць развіццю культуры і мастацтва.

Гэтае пытанне разглядалася на калегіі Міністэрства культуры і друку 11 снежня 1995 г., калі быў ухвалены праект закона і было вырашана прапанаваць яго з дапрацоўкамі ў Кабінет Міністраў РБ. У абгрунтаванні гэтага рашэння гаварылася,

што сучаснае эканамічнае становішча разбуральна дзейнічае на каштоўнасныя арыентацыі творчых работнікаў, якія аказаліся безабароннымі перад камерцыялізацыяй культуры. Існуе яскравая неабходнасць стварыць умовы свабоднай творчасці. Саюзы творчых работнікаў Беларусі знаходзяцца ў цяжкім стане. І хаця яны павінны абараняць інтарэсы сваіх членаў, што на самай справе мала што могуць зрабіць у гэтым накірунку, таму што «самі знаходзяцца ў крытычным стане і нават на грані вымушанай самаліквідацыі з-за слабой прававой, сацыяльнай і эканамічнай абароны з боку дзяржавы ва ўмовах станаўлення рыначных адносін». [3, арк. 96-99]

Закон "Аб творчых саюзах і творчых работніках", які быў прыняты толькі 16 снежня 1999 г., у поўнай меры не апраўдаў чаканняў, якія на яго ўскладаліся. Гэты дакумент меў дэкларатыўны характар, і, каб ён пачаў рэальна дзейнічаць, неабходна распрацаваць сістэму нарматыўных актаў. [1, с. 58-70] Закон не прапаноўваў ніякіх канкрэтных ільгот у падаткаабкладанні. Зніжэнне платы за камунальныя паслугі, электраэнергію і арэнду памяшканняў, прадугледжваў Указ Прэзідэнта РБ ад 29 красавіка 1997 г. "Аб мерах па дзяржаўнай падтрымцы творчых саюзаў". [5, с. 17] У 2001 г. указам Прэзідэнта ад 9 ліпеня творчыя саюзы Беларусі былі вызвалены ад выплаты падаткаў на прыбытак і на дабаўленую вартасць. У каментарыі да гэтага ўказа сцвярджалася, што "грамадскія аб'яднанні творчых работнікаў не ўваходзяць у дзяржаўныя структуры", аднак "ажыццяўляюць работу дзяржаўнай важнасці". [195, с.2]

Вельмі мала на Беларусі існуе прыватных устаноў культуры. Сярод найбольш жыццяздольных можна лічыць прыватны тэатр у Гомелі. Гомельскі незалежны тэатр адкрыўся 13 кастрычніка 1992 г. і існаваў на сродкі прадпрымальніка Рыгора Фігліна. Тэатр перажыў фінансавы крызіс і перыяд нестабільнасці пасля трагічнай гібелі фундатара, аднак працягваў сваё існаванне пад апекай яго сястры Г. Шофман. [6, с. 95]

Яўныя недахопы ў заканадаўстве не даюць магчымасці існаваць такой форме тэатра, не гледзячы на тое, што праблема існуе даўна і патрабуе свайго вырашэння. Асабліва адчуваюць цяжкасці тыя установы, якія дзейнічаюць на грані мастацтва і камерцыі. У першую чаргу гэта мастацкія галерэі і недзяржаўныя тэатральна-канцэртныя ўстановы.

Фарміраванне мастацкага рынка на Беларусі праходзіць вельмі павольна і марудна. Гэта можна растлумачыць невялікім попытам твораў мастацтва ў насельніцтва, нават пры ўмовах, што яны каштуюць у некалькі разоў танней, чым у краінах Еўропы. Аднак мастацкі рынак развіваўся б інтэнсіўней у выпадку развіцця турызму на Беларусі. Для замежных турыстаў творы мастацтва могуць стаць добрым сувенірам. Адсутнасць заканадаўчай базы не дазваляе фарміравацца мастацкаму рынку Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Аб творчых саюзах і творчых работніках. Закон Рэспублікі Беларусь // Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. — № 36, 1999. — Мінск, 2000. — С.58—70.

2. Архіў Міністэрства культуры і друку РБ. Ф. 974, воп. 1, спр. 3.

3. Архіў Міністэрства культуры і друку РБ. Ф. 974, воп. 1, спр. 46.

4. Беларусь: выбор пути. Национальный отчёт о человеческом развитии. 2000. — Мінск: «Тарпей принтинг хаус», 2001. — 121 с.

5. Краткий комментарий к закону «О творческих союзах и творческих работниках» // Вестн. молодёж. научн. общ—ва. — 2000. — № 4. — С. 12—18.

6. Тэатры Беларусі. – Мінск: Тэатральная творчасць, 1998. – 135 с.

7. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 374 "Аб вызваленні асацыяцыі грамадскіх аб'яднанняў "Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў" і творчых саюзаў Рэспублікі Беларусь ад выплаты падаткаў на прыбытак і дабаўленую вартасць" // Культура. —2001. — 14–20 ліп. —С.2.